

а б в г

*Рисунок 5* – Этапы построения гиперболического орнамента



*Рисунок 6* – Гиперболический орнамент с базовым элеметом белоруского узора.



*Рисунок 7* – Построение розетки с использованием деформации базового элемента.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Список литературы:**


1. Степанова, А. Теория орнамента: учеб. пособие / А. Степанова. – Ростов на Дону : Феникс 2011. – 149 с.
2. Goodman-Strauss, C. Compass and Straightedge in the Poincare disk / C. Goodman-Strauss // American Mathematical Monthly –Texas: Sam Houston State University, 2001. – Vol. 108, №. 1, p. 38 – 49.
3. Песецкая, Т.И. Фрактальный орнамент на базе традиционного белорусского узора / Т.И. Песецкая // Сборник научных работ участников международной научной конференции “Аўтэнтычны фальклор”, 25-27 апреля 2014. – С.121.


***Павел Сапоцька***

## ПАТЭНЦЫЯЛ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСКІХ РЭГІЁНАЎ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАГА КЛАСТАРА «ШЛЯХАМІ РАДЗІМІЧАЎ»

Канвенцыяй ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (Парыж, 2003 г.) пад нематэрыяльнай культурнай спадчынай разумеюцца «практыкі, формы падачы і выражэння, веды і навыкі, а таксама звязаныя з імі інструменты, аб’екты, артэфакты і культурныя асяродкі, прызнаныя супольнасцямі, групамі і, у некаторых выпадках, асобнымі людзьмі ў якасці часткі іх культурнай спадчыны» [1].

Нематэрыяльная культурная спадчына прадстаўлена «вуснымі традыцыямі і формамі выражэння, якія ўключаюць мову ў якасці носьбіта нематэрыяльнай культурнай спадчыны, выканальніцкім мастацтвам, звычаямі, абрадамі, святамі, ведамі і сацыяльнымі практыкімі, якія адносяцца да прыроды і сусвету, ведамі і навыкамі, звязанымі з традыцыйнымі рамёствамі» [1].

Кожны беларускі рэгіён ганарыцца сваёй нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчынай, вельмі багатай і разнастайнай. У нашым артыкуле засяродзім увагу на нематэрыяльных праявах творчасці ў чатырох раёнах Магілёўскай вобласці – Чавускім, Чэрыкаўскім, Дрыбінскім, Слаўгарадскім, якія ўваходзяць ў сацыяльна-культурны турыстычны кластар «Шляхамі радзімічаў». Кластар распрацаваны Магілёўскім

дзяржаўным універсітэтам імя А.А. Куляшова, Магілёўскім экалагічным грамадскім аб’яднаннем «ЭНДА» і ТАА «Чавускі бізнес-цэнтр» пры фінансаванні Праграмы «Падтрымка экалагічных арганізацый грамадзянскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь і Малдове SECTOR» Рэгіянальнага экалагічнага цэнтра для краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы [2, с. 4].

На дадзеныя раёны прыходзілася значная частка тэрыторыі рассялення славянскіх плямёнаў радзімічаў у XI-XII стагоддзях.

У гэтым плане вялікую цікавасць уяўляе аграгарадок Радамль у Чавускім раёне, дзе кожнае лета праходзіць свята «У госці да радзімічаў». Тут можна пазнаёміцца з культурай племені, паглядзець тэатралізаванае прадстаўленне са старажытнымі абрадамі, прыняць удзел у здабыванні жывога агню і распальванні рытуальнага вогнішча.

У Чавускім раёне знаходзіцца «Байкова крыніца», якая з'яўлялася для нашых продкаў месцам пакланення сілам прыроды і паганскім багам; зараз жа гэта месца правядзення праваслаўных абрадаў. «Тут няма нічога лішняга, крыніцы захавалі сваю прыродную прыгажосць, і шматвекавыя зносіны з людзьмі не змаглі прыўнесці сюды “выгоды цывілізацыі”» [2, с. 89].

Усе крыніцы надзяляюцца сакральным сэнсам, таму ўяўляюць цікавасць з пункту гледжання культуры. Прыклад таму – традыцыя паломніцтва і пакланення «Блакітнай крыніцы» (іншыя назвы «Клінаўская крыніца», «Макавееўская крыніца», «Сіні калодзеж») у Слаўгарадскім раёне. Носьбітамі дадзенай традыцыі з’яўляюцца таксама жыхары ўсходніх раёнаў Магілёўскай і Гомельскай абласцей Беларусі, асобных рэгіёнаў Расіі і Украіны. Асабліва ўрачыста спраўленне традыцыі паломніцтва і пакланення «Блакітнай крыніцы», звязаных з ушанаваннем Жыватворнага Крыжа Гасподняга, Божай Маці і святых пакутнікаў сямі братоў Макавеяў, праводзіцца падчас народнага свята Макавей (Мядовы Спас) 14 жніўня. «Людзі ідуць за святой вадой з хрысцільні Вадохрышча сваіх продкаў, бяруць удзел у хросным ходзе, малебне, асвячэнні крынічнай вады і купанні ў ёй. Святары хрысцяць малых дзяцей і дарослых. Завяршаецца свята наведваннем і пакланеннем асвячоным старажытным валунам, што знаходзяцца на нерукатворнай паляне» [4].

Традыцыі паломніцтва і пакланення святой «Блакітнай крыніцы» больш за тысячагоддзе. Паводле падання, менавіта з «Блакітнай крыніцай» звязана хрышчэнне нашых продкаў. Здарылася гэта пасля бою радзімічаў з войскам князя Уладзіміра ў 984 годзе на легендарнай рацэ Пішчань (зараз Пясчанка). «Кіеўскае войска на чале з ваяводам па мянушцы Воўчы Хвост атрымала перамогу і прымусіла радзімічаў падпарадкавацца. А праз некалькі гадоў пасля крывавых падзей князь Уладзімір даслаў святароў іх хрысціць. Тады і былі ахрышчаны правадыры і найбольш знатныя людзі славянскага племені. А пазней, калі хрысціянства пачало распаўсюджвацца на гэтых тэрыторыях, і само месца гэтае было асвечана» [4]. Таму жыхары надзяляюць крыніцу звышнатуральнымі ўласцівасцямі. Згодна з павер'ем, калі тройчы ўвайсці ў яе ўброд, цела напаўняецца жыватворчай энергіяй, а хваробы адступаюць.

Традыцыя прадстаўляе ўнікальную з’яву, бо знаходзіцца на скрыжаванні язычніцкай і хрысціянскай культур: язычніцкай, таму што адбываецца пакланенне прыроднаму аб’екту, хрысціянскай – таму што звязана з шанаваннем Жыватворнага Крыжа Гасподняга, Божай Маці і святых пакутнікаў сямі братоў Макавеяў. Унікальнасці феномена адпавядае добра захаваны традыцыйны культурны ландшафт: вёска Кліны Слаўгарадскага раёна, дзе жылі людзі вельмі сталага ўзросту ў старадаўніх драўляных хатах, знаходзілася сярод густых лясоў і палёў, а пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС у 1986 годзе была выселена…

Дзякуючы цікавасці мясцовых жыхароў і мясцовых уладаў, а таксама падтрымцы традыцыі Беларускай праваслаўнай царквой адбываецца працэс трансляцыі старажытных абрадаў у сучасным культурным асяродку. Зараз крыніца «Сіні калодзеж» – гідралагічны помнік прыроды рэспубліканскага значэння.

Слаўгарадскі рэгіён таксама вядомы сваім Фестывалем традыцый і рамёстваў «Гаспадарчы сыр», які накіраваны на адраджэнне традыцый хатняга вырабу сыру. На свяце звычайна прадстаўлена каля 50 відаў сыроў, выробленых з малака кароў і коз; можна прадэгуставаць мноства разнастайных страў, прыгатаваных на аснове сыру.

Моцны культурны патэнцыял засяроджаны ў Дрыбінскім раёне, што прываблівае турыстаў творчасцю майстроў-шапавалаў. Тут ёсць магчымасць пазнаёміцца з працай майстроў-шапавалаў, якія выкарыстоўваюць традыцыйныя тэхналогіі вырабу з воўны, поўсці жывёл (авечак, коз) валёнкі і мужчынскія галаўныя ўборы (шапкі-магеркі і брылі), якія выкарыстоўваюцца па прамым прызначэнні і ў якасці сувеніраў.

Згодна з меркаваннем этнографа Е.Р. Раманава, шапавальства на Дрыбіншчыне з’явілася ў пачатку XVIII стагоддзя. Другая версія сведчыць, што калісьці ўладальнік маёнтка на тэрыторыі сённяшняга горада Антон Цеханавецкі аддаў некалькі сваіх маладых сялян для навучання валяльнаму рамяству ў Ніжагародскую губерню, адкуль яны праз некаторы час вярнуліся на радзіму, набыўшы неабходныя веды [3].

Дрыбінскія шапавалы выкарыстоўвалі паўночна-ўсходні дыялект беларускай мовы – «катрушніцкі лемязень», каб трымаць у сакрэце прыёмы рамяства. Лексічны склад яе налічвае 915 слоў [5].

Рамяство захоўваецца дзякуючы працы клуба «Шапавал» пры Дрыбінскім гісторыка-этнаграфічным музеі, арганізацыі майстар-класаў і, безумоўна, перадачы ведаў у сем'ях майстроў, якіх на Дрыбіншчыне налічваецца 12 чалавек.

Яшчэ ў рэгіёне існуюць сапраўдныя цэнтры майстэрства па пляценні лапцей – самага старажытнага абутку краін Усходняй Еўропы – у вёсках Абраімоўка, Жавань, Кароўчына. У дрыбінскіх вёсках лапці з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліпавага лыка насілі з глыбокай даўніны амаль да сярэдзіны XX ст. Нягледзячы на тое, што лапці страцілі сваё функцыянальнае прызначэнне як абутак, яны з'яўляюцца адным з важнейшых сімвалаў традыцыйнага нацыянальнага побыту, з імі звязана шмат розных павер'яў.

Турыстам, якія прыбываюць сюды, будзе цікава пазнаеміцца з пастаяннай выстаўкай «Лапці – абутак нашых продкаў» удзельнікаў гуртка «Лапаточак» у Доме рамёстваў в. Кароўчына, паглядзець дакументальны фільм аб творчасці майстроў пляцення лапцей Дрыбінскага раёна, якія зберагаюць і адраджаюць майстэрства продкаў і перадаюць яго наступнаму пакаленню.

Адной з галоўных культурных падзей на Дрыбіншыне з'яўляецца рэгіянальны фестываль народнай творчасці, промыслаў і рамёстваў «Дрыбінскі таржок», які бярэ свой пачатак яшчэ ў XIX стагоддзі. Гасцям фестывалю прапануецца набыць лекавыя травы, гарбату і лячэбныя венікі, паспрабаваць наварыстую юшку і іншыя стравы з рыбы, паўдзельнічаць у арыгінальных рыбацкіх забавах, набыць мёд, прысмакі, медавуху і г.д.

Візітная картка Чэрыкаўскага раёна – абрад «Бразгун» з ушанаваннем абраза святых Пятра і Паўла ў вёсцы Наркі. Легенда, перадаваемая з пакалення ў пакаленне, данонасіцца да сённяшніх дзён. «Паміж густога лесу, на ўзвышшы, на скрыжаванні сцяжынак, прыкметных толькі зверу нябачнаму і рэдкаму чалавеку, нечакана з-пад зямлі ўдарыў сцюдзёны ключ. Пенна-белы струмень быў такой моцы, што ўзняў вышэй макавак дрэў мноства дробных каменьчыкаў, перазвон-грукат якіх разляцеўся наўкола на некалькі вёрст. На незвычайны гук збегліся старыя і малыя, у страху асяняючы сябе крыжам, баслаўляючы святых Пятра і Паўла, якія менавіта 13 ліпеня паслалі людзям цуд зямны». Вада супакоілася, і з гэтага часу крыніцу сталі лічыць святой. Кажуць, што менавіта яна выратавала вёску ад пажараў, якія не былі на той час рэдкасцю, дапамагла перажыць цяжкі дарэвалюцыйны час, не дала згінуць падчас Вялікай Айчыннай вайны.

У абрадзе, якому больш як два стагоддзі, удзельнічаюць практычна ўсе жыхары вёскі, якія ў гэты дзень упрыгожваюць абраз рознакаляровымі ручнікамі, ставяць абрадавыя свечкі і спяваюць перад ім псалмы, затым нясуць да цудатворнай крыніцы і асвячаюць. Завяршаецца абрадавая дзея абрадавай ежай і малітвай, якія павінны прынесці дабрабыт і спакой вёсцы і яе жыхарам.

Усе пералічаныя праявы творчай дзейнасці чалавека ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Нематэрыяльныя каштоўнасці – паказальнік устойлівасці, пераемнасці пакаленняў і фактар турыстычнай прыцягальнасці рэгіёнаў.

**Спіс літаратуры:**

1. Конвенция ЮНЕСКО об охране нематериального культурного наследия / Организация объединенных наций [Электронный ресурс]. – 2015. – Режим доступа: http://www.un.org/ru/documents/decl_conv/conventions/cultural_heritage_conv.shtml. – Дата доступа: 11.03.2015.
2. Развитие агроэкотуризма: Чаусская школа / Е.И. Пахоменко [и др.] ; МЭОО «ЭНДО»; под общ. ред. Е.И. Пахоменко. – Могилев, 2013. – 100 с.
3. Творчасць майстроў-шапавалаў / Інвентар нематэрыяльнай культурная спадчыны “Жывая спадчына Беларусі” [Электронный ресурс]. – 2013. – http://livingheritage.by/nks/2133/ Дата доступа: 18.03.2015.
4. Традыцыя паломніцтва і пакланення «Блакітнай крыніцы» / Інвентар нематэрыяльнай культурная спадчыны “Жывая спадчына Беларусі” [Электронный ресурс]. – 2013. – http://livingheritage.by/nks/1132/ – Дата доступа: 18.03.2015.
5. Хныкава, А. Светлае свята крынічнай вады і душы / А. Хныкава // Веснік Чэрыкаўшчыны. – 2010. – 19 ліпеня. – С. 5 – 6.

*Ся Лэй*

## ПОПУЛЯРИЗАЦИЯ КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ КИТАЯ (НА ПРИМЕРЕ ДНЕЙ КИТАЙСКОГО КИНО В БЕЛАРУСИ)

Начиная с 1992 года, после установления дипломатических отношений, был заложен прочный фундамент для формирования и развития двусторонних взаимоотношений в сфере культуры и искусства. Несмотря на значительные отличия в мировоззрении, образе жизни и в культуре, художественное наследие китайского народа вызывает значительный интерес у белорусской публики. Одной из форм популяризации культурного наследия Китая в Беларуси стали дни, а в 2014 году – кинофестиваль, китайского кино. Главное место в данном мероприятии занимает собственно киноискусство, а также укрепление культурных связей. Дни китайского кино проходят в форме демонстрации кинофильмов в кинотеатре, представляя собой фестиваль искусств, организованный правительственными учреждениями Беларуси и Китая. Так как в течение последних нескольких лет фестиваль китайского кино в Беларуси проводился в рамках одной недели, его стали называть «неделей кино». Особенность этого фестиваля состоит в том, что, во-первых, он обладает очень высоким художественным уровнем, все выбранные для демонстрации кинофильмы являются образцовыми представителями китайского киноискусства и обладают значительной силой социального воздействия, отражая современное состояние развития китайского киноискусства; во-вторых, этот фестиваль является в высшей

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ